**Наша святыня**

За ўсе гады свайго прэзідэнцтва я ні разу не дазваляў сабе зайсці ў пуўчу са стрэльбай. І гэтага ж патрабую ад іншых высокіх чыноўнікаў.

З кастрычніка у Белавсжскай пушчы прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, Прысвечаныя 600-годдзю надання пушчы запаведнага статусу.

Свята праходзіла на Царскай паляне ў глыбіні ляснога масіву. І хоць гэта Далекавата ад адміністрацыйных будынкаў і туды можна было даехаць толькі на спецыяльна выдзеленым транспарц, людзей на паляне сабралася нямала. У Белавежскую пушчу прыехалі госці з розных рэгіёнаў Беларусі і суседніх краін. Самую вялікую дэлегацыю прыслала Польшча. Узначальваў яе намеснік міністра аховы прыроднага асяроддзя Януш Залескі. Сярод польскіх гасцей былі ваяводы, маршалкі, дэпутаты сейма — усяго 43 чалавекі. Гэта і зразумела, бо з польскім бокам Нацыянальны парк падтрымлівае самыя цесныя сувязі пушча адна.

Выступленне Прэзідэнта Беларусі стала кульмінацыяй свята.

—Авеяная легендамі Белавежская пушча — апошні вялікі лес Еўропы, дзі восны помнік прырады, які і многія называюць адным цудаў свету. І гэта сапрауды так.І гэта больш, чым цуд свету. Пушчай можна не толькі любавацца, а гэты спрадвечны свет, унікальны па біялагічнай разнастайнасці, можна выкарыстоўваць для здароўя людзей, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, — гэта адзін з нацыянальных сімвалаў Беларусі, найвялікшы набытак і гонар народа.

У сваёй прамове Прэзідэнт падкрэсліў, што як кожны японец імкнецца пабываць на гары Фудзіяма, так і беларус хоць раз у жыцці павінен наведаць Белавежскую пушчу, бо гэта наша святыня.

І ў будучыні, напэўна, так і будзе. Паток турыстаў у пушчу расце з кожным і одам, за апошні час іх пабывала тут 440 тысяч. Асабліва папулярны ў турыстаў зімовы перыяд, калі можна наведаць сядзібу Дзеда Мароза.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што запаведнік павінен служыць народу, яго будучыні, а не выкарыстоўвацца для лалявання і забавы саноўных асобаў, як гэта было у розныя гістарычныя перыяды. Закрануўшы сённяшні дзень, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў пушчы будаўніцтва весціся не будзе, а вось у вёсках па перыметры Белавежскай пушчы — а гэта амаль 250 км — інвестары могуць набыць зямлю на ільготных умовах для стварэння інфраструктуры.

А асноўным матывам у прамове кіраўніка дзяржавы было захаванне Белавежскай пушчы ў яе спрадвечным выгпядзе для наступных пакаленняў.

Аднак Беларусь славіцца не толькі Белавежскай пушчай. Ва ўсіх рэгіёнах краіны маюцца ўнікальныя прыродныя аб'екты: нацыянальныя паркі «Нарачанскі», «Прыпяцкі», “Браслаўскія азеры”, Бярэзінскі біясферны запаведнік, заказнікі «Налібоцкі», «Альманскія балоты», «Сярэдняя Прыпяць» і іншыя. Усяго налічваецца| каля паўтары тысячы асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый, якія займаюць амаль 2 млн га. Гэта больш за 8 % ад агульнай тэрыгорыі краіны. «Бадай, у Еўропе няма такой дзяржавы, дзе б удзельная вага прыродных запаведных месцаў была такой значнай. Беларусь упэўнена ўтрымлівае лідарства ў гэтым плане», — адзначыў кіраўнік дэяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ўклад сучаснай Беларусі ў забеспячэнне экалагічнай бяспекі чалавецтва недаацэньваюць.Нажаль, не ўсе нашы замежныя партнёры разумеюць і па заслугах ацэньваюць уклад сучаснай Беларусі ў забеспячэнне экалагічнай бяспекі чалавецтва, тую напружаную працу і вялізныя выдаткі па падтрымцы парадку на прыродных тэрыторыях, якія ахоўваюцца», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, дпя эканомікі вельмі стратна вывядзенне з актыўнага гаспадарчага абарачэння і ўтрыманне ў ахоўным рэжыме такіх вялікіх тэрыторый. "Але мы на гэта ідзём. Таму што жывём не адным днём, а клапоцімся пра непаўторнасць і прыроднае багацце роднага краю, улічваем інтарэсы не толькі свайго народа і будучага пакалення беларусаў, але і ўсяго еўрапейскага рэгіёна», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Беларускія пушчы і лясы, азёры і рэкі самым дабратворным чынам уплываюць на клімат

планеты, па праву лічацца лёгкімі Еўропы", — дадаў Апяксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржава і надалей будзе паслядоўна развіваць усю прыродна-запаведную гаспадарку. Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне, што на захоўванне і стварэнне інфраструктуры запаведных месцаў Беларусі будзе накіроўвацца 5 % сродкаў фонду аховы прыроды. Гэтыя сродкі паччуць паступаць ужо з 1 студзеня 2010 года. «Спадзяюся, вы, як руплівыя гаспадары, з карысцю іх выкарыстаеце», — сказаў юраўнік дзяржавы.

Кіраунік дзяржавы ўзяў удзел у цырымоніі адкрыцця адмістрацыйна-эканамічнага цэнтра з музеем прыроды.

Прэзідэнт Беларусі зрабіў запіс у Кнізе ганаровых гасцей. У дзень урачыстых мерапрыемстваў, 3 кастрычніка 2009 года, быў выпушчаны ў абарачэнне паштовы блок з трох марак. Падчас свята было арганізавана памятнае гашэнне марак спецыяльным штэмпелем.

Калі раніцай было даволі зябка, то бліжэй да абеду надвор'е палепшылася і пушча павесялепа пад сонцам.

На сцэну падымаліся танцоры і славакі — свята працягвалася.

Дзяржаўны акадэмічны хор імя Г.Цітовіча змяніў знакаміты літоўскі ансамбль «Ліетува», пацешылі гледачоў і «Прымакі» з Польшчы. У гэты дзень беларускія песні гучалі часта. Ансамбль «Палац», Анжэліка Агурбаш, цыганскі ансамбль нагадалі прысутным, як хораша гучаць песні на роднай мове.

З першымі акордамі песні «Белавежская пушча», якая стала гімнам Нацыянальнага парку, на сцэну падняліся Аляксандра Пахмутава і Мікалай Дабранраваў — аўтары песні. Пасля таго, як паэт эмацыйна прачытаў свой верш, «Белавежская пушча» загучэла на поўную моц.

Ніводнае свята у нас не абыходзіцца без народных майстроў. У Белавежскую пушчу яны з'ехаліся з усёй Беларусі. Вось Наталля Клапкова з Гомеля нешта пляце з лазы, а побач працуе яе каляжанка з Полацка.

Апошні беларускі дудар з Лунінца Мікалай Ярховіч іграе на дудках, якія сам і вырабляе з крушыкы. А чаму апошні?

— А таму, што са старэйшага пакалення я застаўся адзін, — сказаў майстар. — Больш няма такіх, хто вырабляў бы дудкі.

Дудку, на якой ён іграе ўжо сорак гадоў, Ярховіч ацаніў у сто тысяч, а астатнія мог бы прадаць і за трыццаць. Але каб набыць тую дудку, трэба ўмець іграць.

Разьбяры па дрэве, вышывальшчыцы, ткачыхі, ганчары, кавалі стварылі тут не адну вуліцу майстроў.

На Царскай паляне можна было сустрэць жыхараў вёскі Камянюкі — І тых, хто працуе ў запаведніку, і тых, хто ўжо на пенсіі. Пазнаёміўся з Леанідам і Валянцінай Бірыцкімі. Леанід Іванавіч трыццаць гадоў адпрацаваў вадзіцелем у запаведніку. Іх дзеці таксама не пакінулі родныя мясціны. Сын у запаведніку працуе, а дачка — у санаторыі «Белая вежа», унукі пакуль яшчэ вучацца.

А як наконт жыцця? Калі лепш — сёння ці некалі?

— Цяпар лепш, бо парадку больш... — быў адказ.

Дарэчы, калектыў нацыянальнага парку даволі вялікі —1299 чалавек, акалі улічыць іх сем'і і тых, хто ўжо на адпачынку, то атрымліваецца, што з лушчай звяэалі сваё жыццё некалькі тысяч чалавек.

Напэўна. чытачам будзе цікава ведаць, якое пагалоўе звяроў у Белавежскай пушчы?

Найбольш тут аленяў — іх 1684, ка другім месцы дзікі — 1635, казуляў — 500, зуброў — 364, лісіц — 333, ваўкоў —21, рысяў —17 і 76 ласёў.

Як бачым, у пушчы ёсць каго і што ахоўваць. І не дзіўна, што рашэннем ЮНЭСКА белавежская пушча ўключана ў спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

А якое ўражанне зрабіла пўшча на замежнага госця, які ўпершыню апынуўся ў нацыянальным парку?

— Толькі даводзілася здзіўляцца, як хутка здолелі вы падняць гэты запаведнік да вўрапейскага ўзроўню, — сказаў Франк Юнг з Чэхіі.

Свята закончылася феерверкам.

Юбілеі праходзяць, а за імі настаюць будні. Калектыву нацыянальнага парку яшчэ неабходна шмат зрабіць, каб Белавежская пушча і надалей засталася візітнай карткай нашай краіны.

***С.Свистунович***

**Источник:** Звязда.-2009.-6 кастр.-С.2.